# СВЯТЫ ГУБЕРТ

*Крыніца друкавання:*
**Святы Губерт / Harodnia.com. – Рэжым доступу: https://harodnia.com/be/uczora/630-svyaty-gubert. – Дата доступу: 23.06.2017 г.**

Штогод 3 лістапада ў некаторых еўрапейскіх краінах адзначаецца Дзень Святога Губерта. У гэты дзень узгадваецца духоўны подзвіг чалавека, які на працягу ўжо 13 стагоддзяў служыць узорам самаўдасканалення. Губерт – агульнахрысціянскі святы, бо ён жыў да падзелу цэркваў 1054 г., ушаноўваецца і каталіцкай і праваслаўнай царквой, лічыцца апекуном паляўнічых, матэматыкаў, оптыкаў, механікаў, а таксама яго лічаць святым, які мае ад Бога дар вылечваць ад шаленства.

Імя Губерт, Хуберт або Хубертус, (з ням.) азначае «бліскучая душа». Губерт нарадзіўся недзе ў 656-658 г. у Францыі, магчыма, у Тулузе. Ён быў старэйшым сынам і спадчыннікам Бертрана, герцага Аквітаніі. Маладым Губерт быў пасланы бацькам да двара Феадорыха III у Парыж, дзе яму была прадастаўлена пасада. Праз нейкі час Губерт узяў шлюб з Фларыбанай, дачкой Дагабера, князя бельгійскага горада.

Хаця Губерт і быў рэальнай асобай, але звесткі пра яго жыццё ў некаторых дэталях разыходзяцца. Гэта адна з версій. Жонка Губерта памерла пры нараджэнні дзіцяці, і Губерт адышоў ад двара, адбыў у лясы Ардэны, дзе цалкам аддаўся паляванню. У гэты момант і адбылося яго ператварэнне і зварот да святой хрысціянскай веры.



У Вялікую Пятніцу, калі ўсе вернікі накіроўваліся на царкоўную службу, Губерт сабраўся праліваць кроў на паляванні. Калі ён пераследваў прыгожага і буйнога аленя і цэліўся яму ў сэрца, жывёла павярнулася да яго: паміж рагоў аленя ён убачыў распяцце Хрыста і пачуў голас: “Губерт, калі не звернешся да Бога, і не ўзвысішся святым жыццём, то хутка трапіш ў пекла". Губерт, моцна уражаны, сышоў з каня і ўпаў перад аленем на калені.



Пасля гэтага цудоўнага знака Губерт склаў з сябе ўсе свецкія тытулы і ўшанаванні, аддаў кіраванне Аквітаніяй і апеку над сваім юным сынам малодшаму брату, а сам паспяшаўся ў Маастрыхт, да біскупа Ламберта. Той прыняў яго і стаў яго настаўнікам у духоўнай навуцы. Вельмі хутка Губерт прыняў святарства і стаў памочнікам святога Ламберта ў кіраванні дыяцэзіяй, а пасля смерці апошняга – яго пераемнікам – біскупам Маастрыхта.

Біскупскае служэнне Губерта было самаадданым, у подзвігу паста і малітвы святы біскуп праводзіў усе дні. Яго праведнае жыццё, казанні, якія заклікалі шанаваць і паважаць ўсё жывое, захоўваць і памнажаць тое, што дае прырода, па-сапраўднаму праславілі нашчадка дынастыі Каралінгаў. У 720 годзе, па дадзеным ад Бога адкрыцці, Губерт перанёс мошчы святапакутніка Ламберта з Маастрыхта ў горад Льеж і стаў яго першым біскупам.



Губерт прапаведаваў Святое Евангелле сярод язычнікаў ў Ардэнах і ў французскай Таскане. Мірна адышоў да Госпада 30 мая 727 або 728 года ў мястэчку Цервюрэн. Да 825 г. яго святыя мошчы знаходзіліся ў храме св. Пятра ў Льежы, затым яны былі перанесены ў бенедыктынскае абатства ў Амдайн. Шанаванне і слава святога Губерта былі настолькі вялікімі, што Амдайн быў неўзабаве перайменаваны ў– “Святы Губерт”. Падчас пратэстанцкай Рэфармацыі святыя мошчы Губерта былі страчаны. Памінальным днём Св. Губерта лічыцца 3 лістапада – дзень перанясення яго мошчаў у Амдайн.

Шанаванне Св.Губерта было распаўсюджана ў Латарынгіі, Фландрыі, Паўночнай Францыі, а таксама ў Рэйнскім рэгёне Германіі, затым яно пранікла ў Англію, у Іспанію. У 1416 у Латарынгіі быў заснаваны рыцарскі ордэн яго імя. У 1444 г. ў якасці адметнай ўзнагароды быў заснаваны ордэн св. Губерта, дэвіз якога быў «IN TRAU VAST» – “Стойкі ў вернасці”. Гэты ордэн стаў адной з вышэйшых узнагарод у кайзераўскай Германіі, праіснаваўшы да 1918 г.



Іканаграфія Св.Губерта вельмі шырокая. Асоба святога і цудоўны сюжэт прыцягвалі шматлікіх мастакоў і скульптараў. Мы бачым Губерта на старадаўніх мініяцюрах, на вітражах ў храмах, на карцінах і гравюрах прызнаных майстроў, у рэльефных і скульптурных выявах, на манетах, на дэкаратыўных рэчах. Герб. Божай ласкай і жаданнем людзей гэтаму сюжэту было наканавана набыць і геральдычнае гучанне. Цалкам заканамерна бачыць Св. Губерта

на гербе горада Сэн-Юбэр, але герб горад атрымаў толькі ў 1819 г. Амаль на тры стагоддзі раней гораду Гродна, аддаленаму ад гістарычных калізій Францыі і Фландрыі, быў падараваны герб з выявай цудоўнага аленя, а Св. Губерт стаў нябесным заступнікам гэтага горада.



Права мець свой уласны герб гарады атрымлівалі адначасова з магдэбургскім правам. Права на самакіраванне дараваў Гродна вялікі князь літоўскі і кароль польскі Ягайла ў 1391 г. А канчаткова магдэбурскае права было зацверджана ў 1496 г. прывілеем князя Аляксандра.

Вялікія князі літоўскія і ў пазнейшыя часы давалі гораду розныя прывілеі, якія забяспечылі яго жыццядзейнасць, як цэнтра рамяства і гандлю.



Менавіта прывілеі вызначалі, колькі і якіх падаткаў павінны плаціць гараджане, дазвалялі пабудаваць млын на Нёмане, тры карчмы на Рынку, давалі гараджанам права набываць землі, секчы лес на гаспадарчыя патрэбы і будаўніцтва дамоў, дазвалялі мець каменную важніцу – збудаванне для гарадскіх вагаў, лазню і нават манетны двор, яшчэ тройчы ў год па цэламу тыдню праводзіць вялікія кірмашы. І галоўнае – быў створаны гарадскі орган самакіравання – магістрат, які засядаў у будынку гарадской ратушы.

Горад атрымаў права мець уласную пячатку, якую ставілі на ўсіх дакументах. На той пячатцы была выява герба, які быў падараваны Гродна ў 1540 г. прывілеем каралевы польскай і вялікай княгіні літоўскай Боны Сфорца “Мы, Бона, з ласкі божай вялікая княгіня літоўская, руская, жамойцкая і г.д., чынім знаменіто тым нашым лістом пану войту і магістрату Гарадзенскаму змясціць на гарадскіх пячатках Гарадзенскіх герб горада і выяву герба зрабіць падобнай да герба Любліна… Дано в Вільне року панскага 1540 у дзень Св. Губерта (3 лістапада)”.



Першыя дакументы, засведчаныя гарадскімі пячаткамі з выявай герба Гродна датаваныя 1565 герб Гродна з выявай аленя існаваў каля 250 гадоў.

Любы герб – рода, горада, краіны, – з’яўляецца кодам, які трэба расшыфраваць.

Трактоўка старажытнага герба Гродна – блакітны шчыт з выявай аленя з залатым крыжам – для нас відавочна. З'яўленне ў гербе аленя – сімвала ваяра і сімвала Сонца – звязана з адным з асноўных заняткаў гараджан – паляваннем. Горад знаходзіўся паблізу Гарадзенскай і Белавежскай пушчаў. Сярод паляўнічых трафеяў асноўнае месца займалі алені: па археалагічных дадзеных сярод костак дзікіх жывёл косці аленя складаюць 25%, і гэта характэрна толькі для Гродна. Агароджа на гербе таксама нездарма. Паляўнічыя будавалі падобныя збудаванні для таго, каб перагарадзіць зверу дарогу. Побач капалі лоўчыя ямы і рабілі засады. Алень, які пераскокваў праз агароджу, станавіўся недасягальным для паляўнічых, вольным. Відаць, узяўшы яго выяву ў свой герб, гарадзенцы хацелі тым самым падкрэсліць свой вольналюбівы характар. Агароджа – гэта і зашыфраваная назва горада Горадзен.




На гербе Гродна – менавіта алень Губерта: паміж яго рагамі ззяе залаты крыж – сімвал існіны, веры, чысціні помыслаў і мудрасці.

У кожным колеры герба зашыфраваны сэнс: блакітны колер – сімвала чысціні, прыгажосці, велічы і лагоднасці; колер золата сімвалізуе багацце, сілу,

справядлівасць, велікадушнасць, пастаянства; а іх спалучэнне дае веру ў тое, што




горад будзе заўсёды квітнець "на славу, каб дагадзіць Богу". Герб размяшчаўся на гарадскіх варотах, на прыгожых будынках, на харугвах. З утварэннем Гродзенскай губерні горад страціў гэты герб і амаль 120 гадоў карыстаўся губернскім. Але алень вярнуўся ў Гродна, і ў міжваенны час, ён зноў стаў гарадскім гербам: яго можна было ўбачыць на пячатках магістрата, спартыўных клубаў, гарадскога тэатра, на паштовых марках.







Зноў перапынак на паўстагоддзя, і, нарэшце, рашэннем Гарсавета ў 1990 г. быў зацверджаны гістарычны герб 16 ст. у яго класічным варыянце. І мы спадзяемся ўжо назаўсёды. Сёння Дзень Св. Губерта, а гэта значыць, што сёння ў розных краінах паляўнічыя і егеры Заходняй Еўропы ўслаўляюць свайго апекуна, арганізуючы шумныя паляўнічыя зборышчы і пышныя балі.

Паданне кажа, што нават стаўшы біскупам, Губерт па-ранейшаму вельмі любіў сабак і паважаў паляванне (у сярэднія вякі служыцелям Бога было дазволена паляваць). Акрамя таго, Губерт не пакінуў свайго захаплення – разводзіць сабак-ганчакоў. Яго псярні атрымалі імя " Ганчакі Святога Губерта "

Ганчак Губерта – гэта сабака бладхаунд, і сапраўднае пагалоўе ганчакоў Губерта, як запэўніваюць, існавала аж да XIX стагоддзя.



Раз на год, у дзень Св. Губерта ў Бельгіі служаць спецыяльную імшу для сабак. Пад скляпеннямі велізарнай царквы ў мястэчку Сэн-Юбэр гучаць не арганныя акорды , а гукі паляўнічых ражкоў , і ў храм урачыста заводзяць сабак ( што наогул забаронена канонамі хрысціянскай царквы). Але дзіўная гэтая традыцыя за доўгія гады ўжо паспела сфармавацца. І не толькі з Бельгіі, але і з іншых краін спяшаюцца са сваімі сабакамі паляўнічыя, каб любімую сабаку акрапілі святой вадой. У царкве ў гэты дзень можна ўбачыць і іншых жывёл, якія маюць дачыненне да палявання: коні і лоўчыя птушкі. У заключэнне свята праходзяць конныя спаборніцтвы.




Як вядома, Святы Губерт ахоўвае жывёлаў ад шаленства і дрэнных паводзінаў Падчас свята спецыяльна пякуць «перапечкі Святога Губерта» , асвячаюць і кормяць імі ўсіх хатніх жывёл, тым самым абараняючы іх ад хвароб. Лічыцца, што калі паляўнічы памоліцца Св. Губерту, то паляванне абавязкова будзе ўдалым.

Традыцыйна ў дзень Св. Губерта ў стралковых клубах праходзяць спаборніцтвы пад назвай «Стральба па птушках». Зробленых з дрэва або срэбра “птушак” прымацоўваюць на дрэвах, пасля чаго прызнаныя майстры дэманструюць свае ўменні. Пераможца аб'яўляецца Каралём стралкоў і носіць гэты тытул да наступных спаборніцтваў.

Гэты дзень адзначаюць у Галандыі, Літве, Латвіі, Чэхіі, Балгарыі. Кожны год у апошнюю нядзелю кастрычніка ў Цервюрэне, мястэчку, дзе калісьці памёр Св. Губерт, ладзяць свята ў яго гонар, і мясцовы святар благаслаўляе каля капліцы хатніх жывёл – коней і сабак.



Недзе за гадзіну да пачатку цырымоніі благаславення насупраць капліцы збіраюцца ўладальнікі сабак. Яны прыходзяць з сем’ямі, з дзецьмі.

А вось і сам святы.

Святкаванне пачынаецца з імшы ў касцёле Святога Яна. Святы айцец абвяшчае благаславенне. Паляўнічы рог з часціцай мошчаў святога. Пасля гэтага працэсія рухаецца да капліцы. Св. Губерт на чале парада. Святкаванне завяршаецца канцэртам. Вельмі хацелася б, каб ушанаванне Св. Губерта, апекуна нашага слаўнага горада, стала добрай традыцыяй, а дзень – 3 лістапада – штогод станавіўся б сапраўдным святам для гарадзенцаў.